**Вэб-квэст “Беларусь мая, ты адзіная!”**
kuleshova1781.blogspot.com







**Аддзел адукацыі, спорту і турызму**
**Слонімскага райвыканкама**
**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**“Касцянёўская базавая школа Слонімскага раёна”**

## “Вузельчыкі на памяць”
па старонках майстар-класа
“Вэб-квэст як спосаб актывацыі вучэбнай дзейнасці навучэнцаў”




**25 красавіка 2018 года**

**Мэта**: вывучэнне магчымасцей сэрвісаў WEB 2.0 для стварэння заданняў вэб-квэсту.

Перад сучаснай адукацыяй стаіць задача пошуку новых відаў і форм арганізацыі вучэбнай дзейнасці. Навучанне павінна быць развівальным у плане развіцця самастойнага крытычнага і творчага мыслення. З гэтай мэтай многія настаўнікі ўжо выкарыстоўваюць праектную тэхналогію, заснаваную на рэсурсах інтэрнэту. Але вялікая колькасць інфармацыі ў сусветнай павуціне і яе якасць не толькі не спрашчаюць працэс работы, але і ўскладняюць яго. Найбольш удалае рашэнне гэтай праблемы — тэхналогія вэб-квэст.

## Што такое вэб-квэст?

**Вэб-квэст** — сцэнарый арганізацыі праектнай дзейнасці навучэнцаў па любой тэме.

**Вэб-квэст** — праблемнае заданне, праект з выкарыстаннем інтэрнэт-рэсурсаў.

## “Плюсы” выкарыстання тэхналогіі

*Вэб-квэст садзейнічае:*

- пошуку інтэрнэт-інфамацыі, якую даручае навучэнцам настаўнік;
- развіццю мыслення вучняў на стадыі аналізу, абагульнення і ацэнкі інфармацыі;
- развіццю камп’ютарных навыкаў навучэнцаў і папаўненню іх слоўнікавага запасу;
- [illegible]
- развіццю даследчых і творчых здольнасцей вучняў.

## Сэрвісы WEB 2.0

**https://pro100tak.com** — рэсурс, пры дапамозе якога можна ствараць візітоўкі, паштоўкі, віншаванні.

**http://puzzlecup.com** — сэрвіс па складанні крыжаванак анлайн для вучобы ці вольнага часу, а таксама па разгадванні крыжаванак іншых карыстальнікаў сайта.

**https://learningapps.org** — інтэрактыўныя практыкаванні, якія можна ўставіць ва ўласны вэб-квэст.

**http://www.getloupe.com** — сэрвіс па стварэнні калажаў, на якім магчыма знайсці цікавыя формы для камбінавання фотаздымкаў.

**http://wordcloud.pro/ru/** — сэрвіс, які дапаможа лёгка і проста ўвасобіць усе творчыя ідэі ў рэальнасць.

**https://onlinetestpad.com** — шматфункцыянальны канструктар тэстаў, філвордаў, крыжаванак.

**http://rebus1.com** — генератар рэбусаў, сэрвіс, які імгненна прапануе гатовыя рэбусы па вашым запыце.

**http://www.x-lines.ru** — сэрвіс па ўпрыгожанні паведамленняў і зваротаў у вашым вэб-квэсце.